Министерство образования Республики Беларусь

Учреждение образования «Барановичский государственный университет»

Федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего образования
«Тамбовский государственный университет имени Г. Р. Державина»

# СПЕЦИАЛИСТ XXI ВЕКА: ПСИХОЛОГО-ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ КУЛЬТУРА И ПРОФЕССИОНАЛЬНАЯ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

Сборник материалов V Международной
научно-практической конференции

(Барановичи, 20—22 октября 2016 года)

Репозиторий БарГУ

Барановичи
БарГУ
2016

УДК 001(063)

Включены материалы докладов V Международной научно-практической конференции «Специалист XXI века: психолого-педагогическая культура и профессиональная компетентность» по актуальным проблемам следующих научных дисциплин и направлений: психология, педагогика, филология, лингвистика и методика преподавания иностранных языков, человек в обществе, организация здоровьесбережения, обучение, воспитание и развитие дошкольников.

Адресовано преподавателям и студентам учреждений высшего образования, магистрантам, аспирантам.

Редакционная коллегия:

А. В. Никишова (гл. ред.), А. В. Прадун, Н. Ф. Захарченя (отв. секретари),
Е. А. Клещёва, Е. Ф. Нестер, К. С. Тристень, А. В. Демидович, Е. И. Белая, О. Н. Фенчук,
И. В. Пинюта, А. А. Савко

Рецензенты:

доктор психологических наук, профессор Я. Л. Коломинский,
кандидат филологических наук, доцент, доцент кафедры русской и зарубежной литературы учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» О. Е. Панькова

Репозиторий БарГУ

**ISBN 978-985-498-740-8**

© БарГУ, 2016

4. Литовченко О. Соціалізація і соціальне становлення особистості: теоретична інтерпретація // Психологія. Педагогіка. Соціальна робота. № 6. 2012. С. 23—25.
5. Николаева Ю. В. Психологические факторы адаптации одаренных подростков в условиях школы-интерната : дис. ... канд. психол. наук : 19.00.13. М., 2003. 188 л.
6. Там же.
7. Чигирин О. Г. Культурно-просвітня діяльність як засіб адаптації дітей в інтернатних закладах спортивного профілю.
8. Там же.
9. Там же.

УДК 930.1.

**А. У. Літвінскі**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# СЛАВЯНАЗНАЎЧАЯ ПРАБЛЕМАТЫКА Ў НАВУКОВАЙ ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ КАНЦА XIX — ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

**Уводзіны.** У дадзеным артыкуле разглядаецца актуальная для беларускай гістарычнай навукі, перш за ўсё для гістарыяграфіі, праблема вызначэння ўкладу айчынных даследчыкаў канца XIX — пачатку XX стагоддзя ў развіццё славістыкі. Аналізуецца славяназнаўчы кантэкст іх твораў пераважна беларусазнаўчай тэматыкі, паказваецца ўплыў на іх навуковую дзейнасць ідэй папярэдніх пакаленняў славістаў, звяртаецца пэўная ўвага, наколькі гэта дазваляе фармат артыкула, на метадалагічныя прынцыпы, якіх яны прытрымліваліся.

**Асноўная частка.** Беларуская славістыка канца XIX — пачатку XX стагоддзя развівалася на даволі трывалым грунце папярэдніх даследаванняў адпаведнай тэматыкі. У XIX стагоддзі за кароткі час славістыка аформілася як навуковая плынь еўрапейскай гуманітарыстыкі, развіваючыся ў якасці галіны індаеўрапеістыкі, аднак набыўшы ў той самы час усе прыкметы самастойнай комплекснай міждысцыплінарнай навуковай галіны [1]. Нямала было зроблена ў гэтым сэнсе і айчыннымі навукоўцамі першай паловы — сярэдзіны XIX стагоддзя, хаця яны, мабыць, яшчэ не ўсведамлялі ў поўнай меры славяназнаўчы кантэкст сваіх даследаванняў [2, с. 89—102]. Нарэшце, неабходна адзначыць вельмі моцны ўплыў расійскай славістычнай традыцыі, якая на першым этапе свайго станаўлення абапіралася на ідэі і напрацоўкі славянафілаў [3, с. 205].

На працягу азначанага перыяду айчыннае славяназнаўства, у адпаведнасці з дамінуючай у той час тэндэнцыяй, мела міждысцыплінарны характар. Вельмі часта ў межах аднаго навуковага твора спалучаліся вынікі філалагічных, фальклорна-этнаграфічных і гістатычных даследаванняў. Разам з тым міждысцыплінарнасць не набывала рысы эклектычнасці (прынамсі, калі весці размову пра найбольш значныя з навуковага пункту гледжання працы). Назапашванне і сістэматызацыя эмпірычнага матэрыялу ішлі поруч з яго навукова-тэарэтычным абагульненнем. Асабліва гэта было характэрна для работ Е. Р. Раманава [4] і, у яшчэ большай ступені, Я. Ф. Карскага [5].

Якія ж навуковыя праблемы ў найбольшай ступені цікавілі беларускіх славістаў канца XIX — пачатку XX стагоддзя? Найперш трэба назваць, здаецца, «вечную» для гісторыкаў, археолагаў, лінгвістаў, антраполагаў, этнолагаў і прадстаўнікоў сумежных навуковых дысцыплін праблему вызначэння прарадзімы славян. У найбольшай ступені тут пашчыравалі на навуковай ніве А. С. Будзіловіч і Я. Ф. Карскі. Першаму з іх належыць фундаментальная, хаця і няскончаная праца «Первобытные славяне в их языке, быте и понятиях по данным лексикальным: исследования в области лингвистической палеонтологии славян» [6]. Даволі грунтоўна праналізаваўшы лексіку гіпатэтычнай праславянскай мовы, аўтар прыйшоў да высновы, паводле якой прарадзіма славян знаходзілася «ва ўмераным поясе Старога Свету і прытым у еўрапейскай яго частцы» [7] (тут і далей пераклад з рускай мовы на беларускую наш. — ***А. Л.***). З пэўнай асцярожнасцю А. С. Будзіловіч выказваў меркаванне, паводле якога славяне ці іх непасрэдныя продкі першапачаткова жылі ў паўночна-заходняй частцы («северо-западных пределах», па тэрміналогіі аўтара) «Скіфіі Герадота і Сарматыі Пталемея», на тэрыторыі «заходніх абласцей Расіі і краін падкарпацкіх», у вадазборах Дняпра і Буга [8].

Даследчык Я. Ф. Карскі схіляўся да таго, каб лакалізаваць славянскую прарадзіму ў асноўным на поўначы ад Прыпяці, іншымі словамі, на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Дакладней кажучы, ён вызначаў тэрыторыю, на якой калісьці жылі першапачатковыя славяне або, як варыянт, праславяне, у арэале вадазбораў «Прыпяці, верхняга Нёмана і ніжняй Беразіны» [9].

Нямала ўвагі айчынныя навукоўцы ўдзялілі праблеме рэканструкцыі протакультуры першых славян. Так, А. С. Будзіловіч, як было ўжо адзначана некалькімі радкамі вышэй, у аснову такой рэканструкцыі паклаў аналіз праславянскай лексікі, слушна лічачы, што словы праславянскай мовы з'яўляюцца найбольш дакладным адлюстраваннем побыта і культуры продкаў. Ён сцвярджаў: «У шэрагу крыніц для вывучэння першабытных эпох жыцця народаў адно з першых месцаў займае мова. Па сваёй старажытнасці яна равесніца першых чалавечых магіл, касцей, прыладаў; але па сваёй выразнасці яна значна пераўзыходзіць гэтыя нямыя сляды чалавечай мінуўшчыны» [10]. І хаця не ўсе высновы даследчыка прайшлі выпрабаванне часам, трэба адзначыць, што плённасць гэтага метаду рэканструкцыі была пацверджана ў працах навукоўцаў-кампаратывістаў наступных пакаленняў.

© Літвінскі А. У., 2016



Рэпазіторый БарДУ

Вучоны Я. Ф. Карскі прытрымліваўся такога ж метаду. Праўда, ён у большай ступені спасылаўся пры гэтым не на выніткі ўласных даследаванняў, а на папярэднюю, даволі грунтоўную навуковую традыцыю, пры гэтым акцэнтавана звяртаючы ўвагу на агульнаіндаеўрапейскую моўна-культурную спадчыну, якая дасталася славянам ад іх продкаў [11].

Беларускіх даследчыкаў цікавілі таксама розныя аспекты даследавання агульнаславянскага язычніцтва ці ўсходнеславянскага язычніцтва ў тым выпадку, калі яны сумняваліся ў існаванні адносна адзінага комплекса агульнаславянскіх веравання. У гэтым сэнсе мелі месца два метадалагічныя падыходы. З аднаго боку, навукоўцы, ураджаныя выключнай архаічнасцю традыцыйных беларускіх вераванняў, бачылі ў іх водгук уяўленняў, уласцівых далёкім продкам, несвядома ці ўсвядомлена ўводзячы пры гэтым духоўную спадчыну беларусаў у агульнаславянскі кантэкст і прымяняючы, па сутнасці, той самы метад зваротнай храналагічнай рэканструкцыі. З другога боку, яны абапіраліся на нешматлікія звесткі пісьмовых крыніц і прасочвалі пэўную эвалюцыю рэлігійна-міфалагічных уяўленняў у традыцыйнай культуры асобных славянскіх народаў, перш за ўсё беларусаў. Зразумела, абодва гэтыя падыходы перасякаліся і ўзаемадапаўняліся, таму, напэўна, нельга катэгарычна сцвярджаць, што адзін з іх меў яскрава вызначаную перавагу.

З пэўнай доляй умоўнасці можна зазначыць, што першы з гэтых падыходаў знайшоў найбольш прыкметнае ўвасабленне ў навуковай творчасці класіка айчыннай этнаграфіі і фалькларыстыкі Е. Р. Раманава. Разгледжаныя ім сюжэты беларускага фальклору паказалі зацікаўленым чытачам, што карані беларускай вуснай народнай творчасці сягаюць у далёкую глыбіню. Напрыклад, аналізуючы комплекс вераванняў, звязаных з імем бадай што галоўнага язычніцкага бога ўсходніх славян Перуна, Е. Р. Раманаў звяртае ўвагу на тое, што «чалавек "забіты перуном", лічыцца шчаслівым, гэтаксама, як і жанчына, што памерла з родаў» [12]. Таксама цікавымі на той час былі яго звесткі пра «перуновы стрэлы» — знаходкі прыладаў працы і зброі каменнага веку, якія мясцовае насельніцтва выкарыстоўвала ў якасці магічных абярэгаў, фетышоў і нават «лекавых сродкаў» [13].

Аддаваў належнае такому падыходу, праўда, у спалучэнні з іншым, адзначаным вышэй, і А. Я. Багдановіч — бацька паэта Максіма Багдановіча, этнограф, аўтар цікавага нарыса «Пережитки древнего миросозерцания у белорусов» [14]. У гэтай рабоце ён дастаткова пераканаўча аналізуе факты пакланення беларусаў агню, вадзе і зямлі, звяртаючыся, калі трэба, да інфармацыі пісьмовых крыніц [15]. Такое ж спалучэнне абодвух падыходаў выяўляе аўтар у працэсе аналізу так рэліктаў культу Перуна і так званай «ніжэйшай міфалогіі», якая са значна большай паўнатой, у параўнанні з культам «вышэйшых» язычніцкіх багоў захавалася ў беларускіх прымхах і забабонах [16].

Асабліва цікавым у А. Я. Багдановіча атрымаўся аналіз глыбіннага зместу Купалля [17]. Ён звярнуў увагу на выключную архаічнасць гэтай святочнай рытуальнай дзеі. Паводле меркавання аўтара, дадзеная абраднасць захавала водгукі такіх язычніцкіх звычаяў, як аргіястычныя святы са «свабодным каханнем», праміскуітэтам, у тым ліку перадшлюбным, адкупленчым, выкраданне нявесты і нават інцэст, табуяваны яшчэ ў язычніцкія часы [18].

Умоўны шлях «ад звестак пісьмовых крыніц да фактаў духоўнага жыцця славянскіх народаў» знайшоў свой адбітак на старонках навуковых твораў Я. Ф. Карскага. Слушнай з'яўляецца зробленая ім заўвага наконт таго, што не заўсёды ў працах навукоўцаў адлюстроўваецца рэальны стан славянскай язычніцкай міфалогіі. У якасці прыкладу Я. Ф. Карскі прыводзіць сітуацыю з такімі персанажамі, як Лада і Лель, якія, на яго думку, пры бліжэйшым разглядзе з'яўляюцца творамі не пацверджанай інфармацыяй надзейных гістарычных крыніц, псеўданавуковай, па сутнасці сваёй, «кабінетнай міфалогіі» [19].

Выяўленню агульнаславянскіх каранёў беларускага фальклору аддаў частку сваёй увагі і М. В. Доўнар-Запольскі. Больш вядомы ў якасці гісторыка, ён, асабліва ў маладосці, займаўся і даследаваннямі фальклорна-этнаграфічнага зместу. Напрыклад, ён дастаткова грунтоўна прааналізаваў «каравайны абрад», вядомы кожнаму, хто хоць раз у жыцці быў на традыцыйным беларускім вяселлі. Сэнс гэтага абрада навуковец бачыў у стымуляванні плоднасці [20]. Разам з тым даследчык хаця і прызнаваў агульнаславянскае паходжанне пэўных з'яў беларускай культуры, аднак, па нашых назіраннях, быў схільны падкрэсліваць адметнасць беларусаў у славянскім свеце.

Аўтар М. В. Доўнар-Запольскі ў сваіх працах разглядаў грамадскі лад першых славян. Ён прааналізаваў паходжанне і эвалюцыю такіх сацыяльных і палітычных інстытутаў, як абшчына, рабства, веча, княжацкая ўлада. Пры гэтым гісторык выказаў наступныя ідэі: абшчына была асноваю жыцця старажытных славян; першыя князі, магчыма, узначальвалі абшчыны; улада князёў была істотна абмежавана вечам, якое мела аналагі ў іншых індаеўрапейскіх народаў; славяне даволі мякка ставіліся да рабоў [21].

**Заключэнне.** У канцы XIX — пачатку XX стагоддзя беларуская славістыка заняла значныя навуковыя дасягненні і назапасіла неблагі патэнцыял, які мог быць выкарыстаны наступнымі пакаленнямі даследчыкаў (і быў імі выкарыстаны). Пры тым, што беларусазнаўчыя даследаванні складалі аснову айчыннага славяназнаўства, навукоўцы, па-першае, не абмяжоўваліся толькі імі, па-другое, імкнуліся ўключыць вынікі сваіх даследаванняў у агульны славяназнаўчы кантэкст. Існавала і адваротная з'ява, калі дасягненні славістыкі выкарыстоўваліся для тлумачэння фактаў беларускай мінуўшчыны і сучаснага жыцця.

Праблематыка, якая разглядалася на старонках навуковых твораў, вызначалася разнастайнасцю: нашых навуковых папярэднікаў цікавілі такія актуальныя аспекты славістыкі, як паходжанне славян, іх першапачатковая культура, матэрыяльная і духоўная, славянскае язычніцтва, фарміраванне і эвалюцыя грамадска-палітычных інстытутаў, агульнае і адметнае ў гістарычным лёсе славянскіх народаў, захаванне і трансфармацыя агульнаславянскай духоўнай спадчыны ў беларускай культуры, перш за ўсё, у айчынным фальклоры.

Не заўсёды навукоўцы азначанага перыяду былі самастойнымі ў сваіх высновах. Часам яны ў большай ступені арыентаваліся на папярэднюю славяназнаўчую традыцыю. Ды і не ўсе іх высновы пацвердзіліся пазней. Аднак яны разам з папярэднікамі стварылі трывалы падмурак, на якім надбудоўваліся і надбудоўваюцца новыя паверхі беларускай славістыкі. Нездарма ж творчыя здабыткі беларускіх даследчыкаў, якія займаліся навуковай дзейнасцю ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя, набылі вядомасць у якасці класікі айчыннага беларусазнаўства як часткі славістыкі і ў гэтым сэнсе не страцілі свайго значэння да нашых дзён.



Рэпазіторый БарДУ

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Лингвистический энциклопедический словарь / гл. ред. В. Н. Ярцева. М. : Сов. энциклопедия, 1990. С. 458. ; Літвінскі А. У. Развіццё беларускай славістыкі ў другой палове XIX — пачатку XX стагоддзя : манаграфія. Баранавічы : БарДУ, 2015. С. 39—40.

2. Карев Д. В. Белорусская и украинская историография конца XVIII — начала 20-х гг. XX в. в процессе генезиса и развития национального исторического сознания белорусов и украинцев. Вильнюс: ЕГУ, 2007. 312 с.

3. Цвікевіч А. Г. «Западноруссизм»: Нарысы з гісторыі і грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Мінск : Навука і тэхніка, 1993. 347 с.

4. Романов Е. Р.: 1) Белорусский сборник : в ? т. Киев : Тип. С. В. Кульженко, 1885. 11, 468 с. Т. 1 : Губерния Могилевская. Вып. 1—2. Песни, пословицы, загадки ; 2) Белорусский сборник. Витебск : Типолитография Г. А. Малкина, 1887. 444 с. Вып. 3 : Сказки ; 3) Белорусский сборник. Витебск : Типо-литография Г. А. Малкина, 1891. 220 с. Вып. 4 : Сказки космогонические и культурные ; 4) Белорусский сборник. Витебск : Типолитография Г. А. Малкина, 1891. 450 с. Вып. 5 : Заговоры, апокрифы и духовные стихи ; 5) Белорусский сборник. Могилев : Тип. Губерн. правления, 1901. IV, 527, [2] с. Вып. 6 : Сказки ; 6) Вильно : Тип. «Русский почин», 1910. 44 с. Вып. 7 : Белорусские народные мелодии. Песни сезонные, обрядовые, игровые, танцы, духовные стихи ; 7) Белорусский сборник. Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1912. 600 с. Вып. 8 : Быт белоруса ; 8) Белорусский сборник. Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1912. 124 с. Вып. 9 : Опыт словаря условных языков Белоруссии с параллелями великорусскими, малорусскими и польскими ; 9) З гісторыка-археалагічнай спадчыны : выбраныя творы / Мін-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Магілёўскі дзярж. ун-т імя А. А. Куляшова. Магілёў : МДУ, 2006. 237, [1] с.

5. Карский Е. Ф.: 1) Белорусы : в 3 т. Варшава : Тип. Варшав. учеб. округа, 1903. Т. 1 : Введение в изучение языка и народной словесности. С приложением двух карт. 10, 467 с. ; 2) Белорусы : в 3 т. Варшава : Тип. Варшав. учеб. округа, 1908. Т. 2 : Язык белорусского племени. Вып. 1. Исторический очерк звуков белорусского наречия. 24, 579 с. ; 3) Белорусы : в 3 т. М. : Типо-литография Т-ва И. Н. Кушнерев и Ко, 1916. Т. 3 : Очерки словесности белорусского племени. Вып. 1. Народная поэзия. 14, 557 с. ; 4) Белорусы : в 3 т. Петроград : 12-я гос. тип., 1921. Т 3 : Очерки словесности белорусского племени. Вып. 2. Старая западнорусская письменность. 8, 247 с.

6. Будилович А.: 1) Первобытные славяне в их языке, быте и понятиях по данным лексикальным: исследования в области лингвистической палеонтологии славян. Киев: Тип. М. П. Фрица, 1878—1879. 22, 392, 15 с. Ч. 1. Вып. 1—2. ; 2) Первобытные славяне в их языке, быте и понятиях по данным лексикальным: исследования в области лингвистической палеонтологии славян. Киев: Тип. К. Н. Милевского, 1882. 153 с. Ч. 2. Вып. 1.

7. Будилович А. Первобытные славяне в их языке, быте и понятиях по данным лексикальным: исследования в области лингвистической палеонтологии славян. Ч. 1. Вып. 1—2. С. 370.

8. Літвінскі, А. У. Развіццё беларускай славістыкі ў другой палове XIX — пачатку XX стагоддзя. С. 91 ; Будилович А. Первобытные славяне в их языке, быте и понятиях по данным лексикальным: исследования в области лингвистической палеонтологии славян. Ч. 1. Вып. 1—2. С. 390—392 ; Літвінскі, А. У. Уклад А. С. Будзіловіча ў развіццё славістыкі // Специалист XXI века: психолого-педагогическая культура и профессиональная компетентность: материалы IV Междунар. науч.-практ. конф., 22 окт. 2015 г., г. Барановичи, Респ. Беларусь / редкол.: А. В. Никишова (гл. ред.), А. В. Прадун, А. А. Селезнёв (отв. ред.) [и др]. Барановичи: РИО БарГУ, 2015. С. 180—183.

9. Літвінскі А. У. Развіццё беларускай славістыкі ў другой палове XIX — пачатку XX стагоддзя. С. 99 ; Карский Е. Ф. Белорусы. Т. 3. Очерки словесности белорусского племени. Вып. 1. Народная поэзия. С. 11 ; Літвінскі А. У. Паходжанне славян у навуковай інтэрпрэтацыі Я. Ф. Карскага // Историко-философские и социально-политические аспекты сохранения национальной идентичности белорусского общества : Дню Победы советского народа в Великой Отечественной войне посвящается : материалы Респ. науч.-практ. конф., 17 апр. 2015 г., г. Барановичи, Респ. Беларусь / редкол.: А.В. Никишова (гл. ред.), А.В. Демидович (отв. ред.) [и др.]. Барановичи : РИО БарГУ, 2015. С. 43.

10. Лингвистический энциклопедический словарь. С. Ш.

11. Карский Е. Ф. Белорусы. Т. 3. Очерки словесности белорусского племени. Вып. 1. Народная поэзия. С. 7—10.

12. Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 4 : Сказки космогонические и культурные.

13. Літвінскі А. У. Развіццё беларускай славістыкі ў другой палове XIX — пачатку XX стагоддзя. С. 72 ; Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 4 : Сказки космогонические и культурные. С. 157.

14. Богданович А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: Этнографический очерк. Гродно: Губернская типография, 1895. III, 186 с.

15. Там же. С. 10, 15—19, 25—29, 81.

16. Там же. С. 67—68, 75—76, 154—180.

17. Там же. С. 110—122.

18. Літвінскі, А. У. Развіццё беларускай славістыкі ў другой палове XIX — пачатку XX стагоддзя. С. 81.

19. Карский Е. Ф. Белорусы. Т. 3. Очерки словесности белорусского племени. Вып. 1. Народная поэзия. С. 94, 156—157.

20. Літвінскі А. У. Развіццё беларускай славістыкі ў другой палове XIX — пачатку XX стагоддзя. С. 113, 147—158.

21. Русская история в очерках и статьях : в ? т. // под ред. проф. М. В. Довнар-Запольского. М., 1904. С. 66—67, 226, 235—236, 243—247, 329. Т. 1.

УДК 316.346

**М. И. Святощик**

*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи*

# ЦЕННОСТНЫЕ ОРИЕНТАЦИИ СТУДЕНЧЕСКОЙ МОЛОДЁЖИ (ПО МАТЕРИАЛАМ ИССЛЕДОВАНИЯ)

**Введение.** Основанием для развития экономики и роста материального благосостояния граждан является устойчивый менталитет нации. Его формирование напрямую зависит от духовного облика современной молодёжи. Понятие духовного облика включает в себя три уровня — мировоззренческие установки, нравственные и социально-психологические качества.

**Основная часть.** В высшей школе республики, наряду с постоянной заботой о качестве профессиональной подготовки будущих специалистов, большое внимание уделяется индивидуальному сознанию современной студенческой молодёжи. В динамично развивающейся, быстро меняющейся среде, окружающей молодого человека, наблюдается переоценка ценностей, их трансформация и новая иерархия. Поэтому имеются определённые сложности в формировании ценностного фундамента молодого поколения.

© Святощик М. И., 2016



Репозиторий БарГУ